Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (157), 2026

УДК 821.161.3 EDN: VHKUOD

# Белетрыстычная паэтыка ў сюжэтах беларускага савецкага апавядання 1920-х – 1930-х гг.

Э.А. Мурзіч

У артыкуле разглядаюцца беларускія апавяданні 1920–1930-х гг. з выражаным белетрыстычным кампанентам. Аналізуюцца канкрэтныя белетрыстычныя прыёмы ў творах (драматычная і меладраматычная інтрыга, мастацкая дэталь і інш.), якія вызначаюць стыль асобных аўтараў, а таксама фарміруюць белетрыстычны дыскурс свайго часу. У якасці параўнальнай базы прыводзяцца апавяданні Міхася Зарэцкага – майстра белетрыстычнай прозы. Раскрываецца ўплыў, які аказалі творы з белетрыстычнай паэтыкай на развіццё беларускай прозы.
**Ключавыя словы:** беларуская савецкая проза, белетрыстычны прыём, мастацкая дэталь, эфект «пазнавання рэальнасці», прыём кантрасту.

The article examines Belarusian short stories of the 1920s and 1930s with a pronounced fictional component. The article analyzes specific fictional techniques in the works (dramatic and melodramatic intrigue, artistic detail, etc.) that determine the style of individual authors, as well as form the fictional discourse of their time. The stories of Mikhail Zaretsky, a master of fiction, are given as a comparative basis. The influence of works with fictional poetics on the development of Belarusian prose is revealed.
**Keywords:** Belarusian Soviet prose, fiction technique, artistic detail, the effect of «recognizing reality», contrast technique.

У 1920–1930-я гг. у беларускай літаратуры пачынаецца этап бурлівага развіцця. Неабходнасць хутка рэагаваць на грамадскія змены пасля войнаў і рэвалюцый, усталяванне новага, савецкага ладу жыцця прывяла да актыўнага развіцця жанру апавядання. Пры гэтым большасць твораў маладых пісьменнікаў у часы станаўлення беларускіх літаратурных аб’яднанняў 1920-х гг. не была вельмі дасканалай па сваім мастацкім узроўні, што звязана з некалькімі прычынамі.

Па-першае, адсутнасць вопыту і адштурхоўванне ад былой празаічнай традыцыі прывялі да аднатыпнасці ў аўтарскіх мастацкіх прыёмах. Так, пісьменнікі звярталіся да літаральнай перадачы рэчаіснасці, спрашчаючы тым самым твор. Па-другое, даволі вузкае тэматычнае кола (рэвалюцыйныя падзеі і паслярэвалюцыйная рэчаіснасць) нязменна прыводзіла да аднолькавых сюжэтаў, рэалізацыя якіх хаця і адрознівалася ў залежнасці ад майстэрства пісьменніка, усё роўна прыпадабняла творы адзін да аднаго. Па-трэцяе, аўтары імкнуліся да завостраных канфліктаў, драматызацыі сюжэту, а не да псіхалагічнай абмалёўкі вобразаў, што таксама спрашчала творы. «Апавяданне ранняга перыяду беларускай савецкай літаратуры часта набывала формы імпрэсіі або контуры прыгодніцкага твора з напружанай фабулай, вострым і дынамічным сюжэтам, тыя формы, у якіх, на думку пісьменнікаў, лепш за ўсё было выявіць накал высокіх пачуццяў, масавы гераізм эпохі» [1, с. 13]. Акрамя таго, час патрабаваў адлюстравання герояў нядаўна мінулых падзей, якія ў абмалёўцы пісьменнікаў былі ідэальнымі і таксама аднатыпнымі.

На пазначанай глебе ў 1920-я гг. у беларускай прозе і пачала актыўна развівацца такая разнавіднасць літаратуры, як белетрыстыка. Белетрыстыка – гэта сярэдзіннае звяно літаратуры, тыя творы, што арыентаваны на забеспячэнне забаўляльнай функцыі. Такая літаратура нярэдка пераймае метады і прыёмы літаратуры высокай, і дзякуючы гэтаму, у адрозненне ад камерцыйна арыентаванай масавай літаратуры, мае пэўныя мастацкія вартасці. Для белетрыстычнай паэтыкі характэрны такія рысы, як эфект «пазнавання рэальнасці» (паглыбленне чытача ў тэкст і кантэкст), наўмыснае стварэнне інтрыгі (часта – выкарыстанне прыёма ключавой дэталі – знакамітага «чэхаўскага ружжа»), увага да псіхалогіі персанажаў для матывацыі іх учынкаў і эмацыянальнага ўздзеяння на чытача.

Ужыванне прыёмаў белетрыстыкі ў творах беларускай літаратуры 1920–1930-х гг. не заўсёды з'яўлялася мэтай іх аўтараў. Часта гэта звязвалася з праявамі так званага «рэвалюцыйнага рамантызму», або «неарамантызму», для якога былі характэрны «супрацьпастаўленне мары і рэальнасці, таго, што магчыма, і таго, што ёсць» [2, с. 84]. Адсюль вынікаюць прыёмы кантрасту і снабачання, характэрныя для белетрыстычнай паэтыкі, этызацыя і эстэтызацыя літаратуры (пытанні маралі, якія ўзнімалі на простым узроўні аўтары-белетрысты), а таксама праца з формай, якая абыгрывала змест, важнае месца тэмы кахання (меладраматычная інтрыга – аснова белетрыстыкі).

У якасці базы для аналізу намі былі выбраны 44 творы, што належаць 14 пісьменнікам, сярод якіх і вопытныя аўтары (Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны), і «маладнякоўцы» (Міхась Чарот, Мікола Нікановіч, Кузьма Чорны, Платон Галавач, Міхась Лынькоў, Васіль Каваль, Рыгор Мурашка, Янка Нёманскі, Сымон Баранавых, Хвядос Шынклер і Эдуард Самуйлёнак). Творы Міхася Зарэцкага будуць згадвацца для параўнання з імі разгледжаных апавяданняў, а таму ў іх колькасць не залічваюцца. Спадчына М. Зарэцкага як майстра найперш белетрызаванай прозы патрабуе асобнага вывучэння. Іншыя аўтары або не лічылі белетрыстычныя прыёмы надзвычай важнымі, або не падымаліся да па-мастацку якаснага белетрызаванага аповеду.

Выбраныя намі творы былі падзелены на 10 *тэматычных* груп: апавяданні пра вайну з польскімі атрадамі і жыццё пад польскай акупацыяй, творы на тэму дэзерцірства, апавяданні пра нечаканыя сустрэчы праз доўгі час, бытавыя аповеды пра сялян, бытавыя аповеды пра людзей розных прафесій, творы пра трагедыі ў жыцці розных людзей, творы пра актыўных камуністычных дзеячаў, апавяданні на тэму жанчын пры савецкай уладзе, творы пра людзей іншых нацыянальнасцей пры новай уладзе, апавяданні пра каханне. Разгледзім, якія белетрыстычныя сродкі выкарыстоўваюць аўтары для раскрыцця адных і тых жа тэм.

**Тэма вайны з «панскай Польшчай»** была адной з самых актуальных для 1920-х гг. Падзеі белапольскай акупацыі адбываліся побач, а многія пісьменнікі непасрэдна ў іх удзельнічалі. Мы вылучылі наступныя апавяданні ў названую групу: «Панскі дух» (1922), «На балоце» (1923), «Шрам» (1933) Змітрака Бядулі, «Маці» (1924) Янкі Нёманскага, «Ядвісін дуб» (1939) і «Крот» (1927) Міхася Лынькова.

Апавяданні ў дадзенай групе прайшлі пэўны шлях ад бытавых замалёвак («Панскі дух» Змітрака Бядулі) да больш складаных твораў, якія можна назваць якаснай белетрыстыкай («Маці» Янкі Нёманскага). Сярод прыкмет белетрыстычнай паэтыкі можна вылучыць просты сюжэт з падзелам персанажаў на «сваіх» і «чужых», матыў пакарання, эфект «пазнавання рэальнасці», агульную бытавізацыю. Так, эфект «пазнавання рэальнасці» ў апавяданні Я. Нёманскага праяўляецца, напрыклад, у шаблонных фразах, характэрных для савецкай эпохі:

*«– Пара ўжо, – і ён хутка ўскочыў з пасцелі.*

*– Куды пара, Рыгор?*

*– Куды? Канчаць рэвалюцыю!»* [3, с. 113].

Яшчэ адзін прыклад – абмалёўка З. Бядулем праз гукапіс пагрозлівай прасторы (балота) як «жывога» месца дзеяння: «*Шурхатала трава затоеным шэптам:*

*«– Ш-ш-ш... с-с-с...*

*Хлюпала балота і гойдалася пад нагамі зыбка-зыбухай.*

*Хлю-ю-п, хлю-ю-п, хлю-ю-п!*» [4, с. 214–215].

Да тэмы вайны з палякамі звяртаўся і Міхась Зарэцкі, хоць цэнтральнай рабіў яе нячаста. Так, можна вылучыць апавяданні «Адкупіўся» (1923), «Бацькаў сын» (1924) і «Ліпа» (1927). Сярод сродкаў белетрыстыкі ў названых творах Міхась Зарэцкі выкарыстоўваў псіхалагізм (што не было характэрным для ранняй навелы ў літаратурах свету).

**Тэма дэзерцірства** – таксама адна з асноўных у 1920-1930-х гг. Нароўні з ідэалізаванымі героямі, якія займаліся ўладкаваннем новага свету, павінны былі дэманстравацца і персанажы адмоўныя, іх ідэйныя антаганісты. Згодна з часам, часта імі становіліся тыя, хто не вытрымліваў цяжкасцяў ваеннага жыцця і дэзерціраваў з арміі. У дадзеную групу мы выдзелілі 5 апавяданняў: «Бегунец» (1920) Цішкі Гартнага, «Дэзерцір» (1923) Янкі Нёманскага, «Уцякач» (1927) Платона Галавача, «Начныя цені» (1928) Сымона Баранавых і «Сінія галіфэ» (1933) Міхася Лынькова.

Сярод сродкаў белетрыстыкі ў творах гэтай групы вылучаецца ўвага пісьменнікаў да матывацыі ўчынкаў персанажаў, іх думак і пачуццяў – для лепшага разумення чытачамі сюжэтнага руху, а таксама меладраматычныя лініі для кантрасту з рэаліямі ваеннага жыцця; сустракаюцца і тыпова белетрыстычныя прыёмы снабачання і пераапранання.

Увогуле архітэктоніка названых апавяданняў падобная: аўтар паказвае персанажа, які дэзерзіруе або толькі плануе збегчы, тлумачыць яго ўчынак пэўным перажытым на вайне вопытам, а пасля паказвае наступствы такога рашэння (пакаранне з боку «сваіх» або «чужых»). Найбольш удала рэалізуюць падобную сюжэтную схему Янка Нёманскі і Платон Галавач. Іх персанажы атрымоўваюць матывацыю, якая сапраўды прымушае задумацца над адмоўным, на першы погляд, учынкам. Напрыклад, цэнтральны персанаж «Уцекача» аказавацца сведкам наступнай жудаснай сцэны, якая значным чынам уплывае на яго рашэнне: «*У гэты момант пачуўся глухі стрэл уперадзе, за ім глухі выбух. На Голуба сыпанула пяском. Цэлая гара пяску і дыму ўзнялася недалёка ад акопаў, дзе былі двое, і захавала іх. Калі растаў дым, усе ўбачылі: старэйшы – скурчаны, з разарваным целам і ў лахманах ад падранай шрапнеллю вопраткі, ляжаў нерухомы. Малады падняўся, сеў і, пазіраючы шырока раскрытымі вачыма на таварышаў, пачаў запіхваць у жывот вывaрачаныя кішкі*» [5, с. 500–501].

Дэзерцір жа Янкі Нёманскага адрозніваецца тым, што пасля ўбачанага дома вяртаецца зноў на поле бою, сваім учынкам падкрэсліваючы неабходнасць барацьбы.

«Начныя цені» Сымона Баранавых вылучае белетрыстычны, нават тэатральны прыём пераапранання. Дасціпнасцю і аўтарскім майстэрствам прыцягвае ўвагу апавяданне Міхася Лынькова, які ўвесь сюжэт будуе вакол вобраза «сініх галіфэ» як трафея, за кошт чаго фарміруецца трагікамічная інтрыга і кантраст са змрочнасцю ваеннага жыцця.

У творчасці Міхася Зарэцкага таксама ёсць твор, прысвечаны тэме дэзерцтва, – гэта апавяданне «У Саўках» (1922). Аднак напісана яно не па сюжэтнай схеме, пазначанай вышэй. У цэнтры апавядання знаходзіцца персанаж, які ўнутрана супраціўляецца свайму выбару стаць дэзерцірам. Аўтар падкрэслівае неаднолькавасць уцекачоў з фронту, а таксама магчымасць для іх стаць на шлях выпраўлення. У гэтым плане апавяданне «У Саўках» суадносіцца з творам «Дэзерцір» Янкі Нёманскага. У якасці сродкаў белетрыстыкі Міхась Зарэцкі ў сваім апавяданні выкарыстоўвае кантраст апісання прыроды і ўнутранага стану хлопцаў-дэзерціраў, а таксама гаворачыя прозвішчы.

Асобным пунктам мы вылучылі **тэму нечаканай сустрэчы**. Менавіта эмацыянальнае аб'яднанне людзей у творах з такім сюжэтам знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Апавяданняў на гэтую тэму няшмат, мы вылучылі тры: «На руінах» (1923) Цішкі Гартнага, «Дачка эскадрона» (1937) і «Апавяданне пра гуманізм» (1937) Эдуарда Самуйлёнка.

Для твораў гэтай групы з элементаў белетрыстыкі найбольш характэрныя прыёмы эмацыянальнага ўздзеяння на чытача. Асноўны сюжэтны ход – нечаканая сустрэча важных адзін аднаму людзей праз доўгі час. Так, у апавяданнях «На руінах» і «Дачка эскадрона» пасля вайны сустракаюцца родныя людзі – браты і сёстры.

«Апавяданне пра гуманізм» вылучаецца сярод астатніх. Тут нечаканая сустрэча адбываецца паміж людзьмі, якія ў мінулым моцна пасварыліся, аднак зараз ад аднаго з іх залежыць жыццё другога. Твор распавядае пра ўрача, якога просяць прыляцець за трыста кіламетраў, каб зрабіць тэрміновую аперацыю на сэрцы. Сама сітуацыя знаходжання пэўнага персанажа паміж жыццём і смерцю ўжо стварае інтрыгу і з'яўляецца характэрным элементам белетрыстычнай паэтыкі. Акрамя таго, напружанасці сітуацыі дадае тое, што сам урач мае сардэчную хваробу і можа не дасягнуць мэты. Дадзены момант прымушае чытача пранікнуцца трывогамі персанажа, бо той рызыкуе ўласным жыццём дзеля будучыні іншага чалавека. Па кантрасце з альтруістычным галоўным героем узнікае яго пацыент, па законах белетрыстыкі, знаёмы ўрачу. Той некалі не дазволіў даць коней, каб адвезці-ўратаваць хворае дзіця, і яно памерла. І сумленны ўрач паўстае паміж уласным прафесійным абавязкам і пачуццямі да хворага, які некалі дазволіў спраўдзіцца трагедыі. Напружанасць выбару перадаецца і чытачу, аднак «чэхаўскім ружжом» выстрэльвае назва: галоўны герой вылечвае чалавека.

У Міхася Зарэцкага апавяданні, дзе ў цэнтры знаходзілася б нечаканая сустрэча разлучаных герояў, адсутнічаюць; у яго прозе такі прыём выглядаў бы залішне надуманым.

**Апісанне быту сялян** пасля рэвалюцыі – адна з самых распаўсюджаных тэм у літаратуры 1920–1930-х гг. Пры гэтым творы дадзенай групы не насычаны элементамі белетрыстыкі, за выключэннем эфекту «пазнавання рэальнасці», якраз звязанага з бытапісаннем. У выніку значная частка апавяданняў на тэму быту сялян апынулася вельмі аднатыпнай па сюжэтах і адносіцца да спрошчанай масавай літаратуры, а не белетрыстыкі. Для аналізу мы вылучылі 9 твораў: «Калгаснік Трыхон Жаролца» (1931) Цішкі Гартнага, «Сон Габруся» (1921) Міхася Чарота, «Кнак» (1927) Платона Галавача, «У млыне» (1927) Сымона Баранавых, «Снег» (1927) Васіля Каваля, а таксама больш выбітныя «Тры крыжыкі» (1925) і «У глушы» (1928) Змітрака Бядулі, «Максімка» (1925) і «Мельнікі» (1925) Кузьмы Чорнага.

У рамках разгледжанай групы трэба адзначыць перавагу эфекту «пазнавання рэальнасці» як асноўнага белетрыстычнага сродку, што часта суправаджае апісанні падзей: праз зварот да гукаперайманняў, абмалёўку жыццёвых рэалій і абставін, у якіх адбываецца дзеянне. Самі творы не маюць нечаканых паваротаў сюжэту, а таму знаходзяцца на мяжы белетрыстыкі і масавай літаратуры.

Асабліва вылучаюцца сярод астатніх сваім высокім якасным узроўнем апавяданні маладога Кузьмы Чорнага, пра якія шмат пісалася даследчыкамі. Звернем таксама ўвагу на творы «Тры крыжыкі» Змітрака Бядулі і «Кнак» Платона Галавача.

«Тры крыжыкі» – твор, пабудаваны з выкарыстаннем нетыповых метафар і самога вобраза «крыжыкаў» – сімвала непісьменнасці народа. «*Шкада зрабілася Янку сваіх крыжыкаў... Ён так да іх прывык за ўсё жыццё...*

*Так прывыкае чалавек да сцен турмы, у якой прыходзіцца яму сядзець часам доўгі час. Пры вызваленні з няволі ён пачынае сумаваць па сваёй каморцы з жалезнымі кратамі*» [4, с. 235].

Апавяданне «Кнак» дэманструе ўвогуле вострасюжэтную сямейную калізію ў сатырычным тоне: бацька з дачкой не могуць падзяліць некалі захаваныя папяровыя грошы, якія, як высвятляецца ў фінале, нічога ўжо не каштуюць. Па-белетрыстычнаму ўдала аўтар фарміруе бытавую інтрыгу і яе раскрывае.

Сярод апавяданняў Міхася Зарэцкага таксама сустракаюцца бытавыя замалёўкі пра сялянскае жыццё. Гэта творы «Цішка Бабыль» (1922), «Парася» (1931), «Пачатак шчасця» (1932), «З нашых дзён» (1923), «Як гэта часам трапляецца» (1922), «Ноччу» (1923), «Адкупіўся» (1923), «Петрык і Пятрусь» (1932). У названых апавяданнях сярод сродкаў белетрыстычнай паэтыкі таксама пераважае эфект «пазнавання рэальнасці». Пры гэтым, самі творы адрозніваюцца між сабой па мастацкім узроўні. Так, напрыклад, апавяданне «Цішка Бабыль» прадстаўляе масавую літаратуру свайго часу, а «Адкупіўся» – якасную белетрыстыку ў жанры навелы з псіхалагічна распрацаваным вобразам цэнтральнага персанажа.

Іншая частка бытавых замалёвак звязана з **жыццём людзей розных «гарадскіх» прафесій**. Сюжэты такіх твораў для 1920-х гг. адкрываюць больш новага чытачу, чым папярэдне разгледжаныя, за кошт адлюстравання новай праслойкі насельніцтва, якой раней не існавала. Мы вылучылі 3 такія творы з групы: «Яйцо і слівы» (1927) Рыгора Мурашкі, «Кларнет» (1928) Міхася Лынькова, «Цагліна казэмата» (1932) Эдуарда Самуйлёнка.

Увогуле дадзеная група – адна з самых белетрыстычна насычаных і незвычайных па сюжэце. Сярод рыс белетрыстычнай паэтыкі аўтары пераважна выкарыстоўваюць ключавыя мастацкія дэталі, часта вынесеныя ў назву, і незвычайныя формы аповеду.

Найбольш ярка ўсе названыя рысы праяўляюцца ў апавяданні Эдуарда Самуйлёнка «Цагліна казэмата». Так, твор мае незвычайную кампазіцыю – падзеі інтрыгоўна пачынаюцца з падзей мінулага ў лакацыі турмы, а пасля апавядальнік пераходзіць да сучаснасці, дзе тую самую турму разбіраюць па цаглінках. Паступова аўтар раскрывае інтрыгу. Яна пераходзіць у моцную сямейную драму (з падтэкстам аб трагедыі цэлага пакалення), што ўвасоблена ў вобразе-сімвале вынесенай у назву цагліны. Ключавыя для сюжэта дэталі з’яўляюцца ў рэтраспектыўных вяртаннях апавядальніка да невядомых спачатку вязняў турмы. Адзін з іх аказваецца сынам брыгадзіра каманды, што турму разбірае.

У творчасці Міхася Зарэцкага таксама прысутнічаюць апавяданні пра быт працоўных. Да іх можна аднесці «З нашых дзён» (1923) і «Пра майго прыяцеля» (1925). Для аўтара гэта радавыя творы, у якіх яго белетрыстычны талент праявіўся слаба.

У асобную групу намі былі вылучаны апавяданні, у цэнтры якіх – **трагедыі ў жыцці людзей**. Правамернасць іх выдзялення звязана з асаблівасцю пабудовы сюжэта, накіраванага менавіта на абуджэнне мінорных пачуццяў у чытачоў. Сярод прааналізаваных апавяданняў мы вылучылі творы «Трагедыя майго настаўніка» (1927) Кузьмы Чорнага, «Плямы» (1927) Сымона Баранавых, «Слёзы веснавыя» (1928) Міколы Нікановіча і «Стрэлачнік Мігай» (1928) Хвядоса Шынклера.

У рамках групы ёсць цікавыя аўтарскія эксперыменты з формай (напісанае лістамі апавяданне «Трагедыя майго настаўніка» або кампазіцыйна пабудаванае на канстрасце «Плямы»). Сярод сродкаў белетрыстыкі вылучаецца інтрыга і адпаведна выбудаваная псіхалагічная матывацыя, якія і вядуць чытача да суперажывання персанажу. Так, напрыклад, Сымон Баранавых (у апавяданні «Слёзы веснавыя») паказвае вачыма апавядальніка яго былога знаёмага, які знаходзіцца на сацыяльным дне праз алкагольную залежнасць. Аднак потым аўтар распавядае нам перадгісторыю персанажа (яго жонку ўкусіў воўк, з-за чаго яна ашалела і памерла), дазваляючы яго зразумець. Праз пералічаныя прыкметы названыя апавяданні, відавочна, знаходзяць месца сярод якаснай белетрыстыкі.

З апавяданняў Міхася Зарэцкага да пазначанай групы можна аднесці ўзоры яго лепшай белетрызаванай прозы: «Кветку пажоўклую» (1926), «Ракавыя жаронцы» (1928), «Бель» (1924), «Дзіўная» (1925), «Ой, ляцелі гусі…» (1929). Названыя апавяданні разам з уплывам на эмоцыі чытача раскрываюць сапраўды вострыя праблемы тагачаснага грамадства. Гэта гісторыі і пра так званых «былых» (людзей, якія не прыстасаваліся да новага жыцця), і пра пэўныя экстрэмальныя з'явы ў савецкім грамадстве («вольнае» каханне), і пра антысацыяльных асоб. Такім чынам, апавяданні Міхася Зарэцкага пры наяўнасці ў іх элементаў белетрыстыкі, відавочна, пераўзыходзяць яе межы.

Пачатак 1920-х гг. патрабаваў адлюстравання ў літаратуры працы тых людзей, якія пераконвалі асноўную частку насельніцтва ў неабходнасці змен. Мы аб'ядналі тэксты з гэтай тэмай пад назвай «**Творы пра актыўных камуністычных дзеячаў**». Усе апавяданні, занесеныя ў пазначаную групу, аб'ядноўвае ідэалізацыя галоўных персанажаў, наяўнасць ідэйнага апанента. Апавяданні, якія былі разгледжаны ў рамках групы, можна аднесці да белетрыстыкі паводле агульнага якаснага ўзроўню распрацоўкі сюжэта («ідэальны», а на самай справе негатыўны галоўны герой пераконвае астатніх у неабходнасці далучыцца да ідэй новага грамадства) і абмежаванай у часе актуальнасці. Сярод сродкаў белетрыстыкі вылучаецца эфект «пазнавання рэальнасці». Тут вылучаюцца тры тыповыя прыклады: «Больш за ўсіх» (1923) і «Трэскі на хвалях» (1923) Цішкі Гартнага, «Ліпы» (1927) Васіля Каваля. У рамках творчасці Міхася Зарэцкага да разгледжанай групы можна аднесці апавяданні «Ворагі» (1923) і «42 дакументы» (1925), у якіх настолькі яскрава перададзены ідэі і дух часу, што яны ўвайшлі ў лік хрэстаматыйных.

Адной з даволі распаўсюджаных у 1920–1930-я гг. была **тэма жанчын**, якія **пры савецкай уладзе** змаглі вырвацца з таго ўкладу жыцця, што быў для іх дагэтуль непарушным. Звычайна, усе творы такога зместу будуюцца па адной і той жа схеме: жанчына, якую ўсё жыццё прыгняталі (памёрлі бацькі, яна працавала на паноў, біў муж), вырываецца з апрыклага жыцця і становіцца паўнавартасным членам камуністычнай партыі і новага грамадства ўвогуле. Мы вылучылі 3 творы на падобную тэму: «Дэлегатка» (1925) Змітрака Бядулі, «Наўздагон за доляю» (1928) Васіля Каваля і «Арыніна перамога» (1931) Якуба Коласа.

Увогуле ж для разгледжанай групы характэрны эфект «пазнавання рэальнасці» і аднолькавая сюжэтная схема. Асабліва ўдала аўтары спраўляюцца з падкрэсліваннем ролі канкрэтнай гераіні, з якой сябе можа суаднесці любая жанчына. Так, напрыклад, твор Змітрака Бядулі «Дэлегатка» заканчваецца наступным радком: «*Шмат такіх Аўгінь бывала на з'ездах, і Аўгіня там бачыла сваю праўдзівую сям'ю*» [4, с. 228]. Аднак агульны ўзровень гэтых апавяданняў пакідае іх у рамках масавай літаратуры сацыяльнага заказу.

Сярод твораў Міхася Зарэцкага таксама сустракаюцца апавяданні пра жыццё жанчын пры савецкай уладзе. Пры гэтым, у аўтара такія творы можна падзяліць на дзве групы: тыя, што адпавядаюць сацыяльнаму заказу сваім пафасам («Ганулля», 1924; «Як Настулька камсамолкай зрабілася», 1925), і тыя, што сумяшчаюць актуальную тэму з драматычным або трагічным фіналам, паказваючы пэўныя негатыўныя наступствы новых тэндэнцый («Дзіўная», 1925; «Кветка пажоўклая», 1926). Белетрыстычная паэтыка М. Зарэцкага значна багацейшая, чым у названых апавяданнях яго паплечнікаў-творцаў, і ўся яна па-майстэрску працуе на раскрыццё драмы жанчыны. Нібыта вызваленая ад усяго былога, яна хоча быць цалкам новай, але ўся яе істота супраціўляецца патрэбе занядбаць абавязкі маці, сястры, дачкі. Прыёмы белетрыстыкі (таямніцы і загадкі, якія закаханы мужчына мусіць разгадаць), па-майстэрску ўплецены ў наратыў, і заканамерна, што «Дзіўная» і «Кветка пажоўклая» з'яўляюцца класікай беларускай навелы.

Ва ўсе часы Рэспубліка Беларусь (паводле сучасных межаў) з'яўлялася краінай шматнацыянальнай. У савецкія часы меў месца курс на распаўсюджанне камуністычных ідэй сярод усіх народаў, таму праблема прыняцця і непрыняцця іншых нацыянальнасцей востра стаяла перад пісьменнікамі 1920–1930-х гг. Сярод твораў пазначанага перыяду мы вылучылі 3 апавяданні, якія раскрываюць **адносіны беларусаў да іншых нацыянальнасцей**. Гэта «Аднаго разу ў нядзелю» (1923) Змітрака Бядулі, дзе расказваецца, як аднавяскоўцы ратавалі свайго суседа-яўрэя; «Ілька» (1928) Васіля Каваля, з сюжэтам пра цыган і іх месца ў савецкім грамадстве; «Ічэ» (1931) Хвядоса Шынклера, у якім яўрэйскі хлопец Ічэ здзяйсняе сваю мару стаць чыгуначнікам.

Творы гэтай групы не змяшчаюць вялікай колькасці канкрэтных прыкмет белетрыстычнай паэтыкі, аднак спосаб пабудовы сюжэту і пасыл, які аўтары спрабуюць данесці чытачу, сведчаць якраз аб прыналежнасці апавяданняў да белетрыстыкі. Сярод белетрыстычных сродкаў вылучаецца зварот да маляўнічых, у нечым экзатычных этнічных асяродкаў і эфект «пазнавання рэальнасці». Напрыклад, у апавяданні «Ілька» Васіля Каваля некаторыя рабочыя ставяць крыжыкі замест подпісаў, што дэманструе не толькі хакрактэрную для часу непісьменнасць, але і новыя перспектывы з павагай да ўсіх рабочых: «*З гулкім сьвістам застанавіўся паравоз на станцыі, а рабочыя пайшлі атрымоўваць плату. Стаялі ля маленькага вакенца касіра, нецярпліва чакалі сваёй чаргі, старанна расьпісваліся ў графе супроць свайго прозьвішча грубымі пальцамі з зямлёю на руках, а некаторыя ставілі крыжыкі; потым пералічвалі грошы і клалі ў замусоленую кішэню порткаў*» [6, с. 4].

Сярод апавяданняў Міхася Зарэцкага тэме іншых нацыянальнасцей прысвечаны твор «Максімаліст» (1928). У ім праз прызму дзіцячага ўспрыняцця паказана састарэласць жыцця цыган, а таксама неабходнасць падтрымкі людзей без знявагі з-за іх нацыянальнага паходжання. Пісьменнік карыстаецца белетрыстычнымі сродкамі, выдатна апісваючы дзіцячую псіхалогію і «прыгоды» хлопчыка з піянерскага атрада, дзяўчынкі з табара, якіх не адразу зразумелі сябры і дарослыя. Важную ролю адыгрывае ў творы эфект «пазнавання рэальнасці».

**Тэма кахання** ўвогуле характэрная для белетрыстыкі, у тым ліку і для прозы 1920-х гг. Аднак магістральнай меладраматычную лінію робіць у сваіх сюжэтах далёка не кожны пісьменнік. Звычайна, каханне толькі дадаецца да тэм працы актывістаў, сялянскага жыцця ці нават дэзерцірства. Тым не менш мы вылучылі пяць апавяданняў, цалкам пабудаваных на перыпетыях кахання. Гэтай тэме прысвечаны «Адукацыя» (1926) Якуба Коласа, «Спатканне» (1920) Цішкі Гартнага, «На мяжы загонаў» (1929) Міколы Нікановіча, «У вагоне» (1928) Міхася Лынькова, «Рамэа і Джульета на Беларусі» (1923) Янкі Нёманскага.

Сярод твораў Міхася Зарэцкага мы вылучылі аналагічную групу, у якую ўваходзяць наступныя апавяданні: «Мар'я» (1922), «На маладое» (1924), «На чыгунцы» (1926), «Навела пра каханне» (1935).

Сярод асноўных белетрыстычных сродкаў аўтары (у тым ліку Міхась Зарэцкі), адпаведна тэме групы, выкарыстоўваюць меладраматычную інтрыгу, часта пабудаваную на несупадзенні поглядаў маладых людзей або іх бацькоў. У такіх творах амаль адсутнічае эфект «пазнавання рэальнасці», бо ўвага накіравана на пачуцці персанажаў. У цэнтры

апавяданняў на тэму кахання знаходзіцца псіхалогія людзей, іх выбар у складаных бытавых сітуацыях. Некаторыя творы з’яўляюцца больш удалымі праз дадатковыя (або, насамрэч, асноўныя) канфлікты, важныя для эпохі (праблемы царквы, вераванняў у апавяданні «Рамэа і Джульета на Беларусі», вайна і яе наступствы ў творах «У вагоне» і «Спатканне», канфлікты людзей са старым поглядам і новай рэчаіснасцю ў апавяданнях «Адукацыя» і «На мяжы загонаў»). Акрамя таго, аўтары, дзякуючы адметнасці ўласных стыляў, выводзяць апавяданні на якасны мастацкі ўзровень (напрыклад, выкарыстанне іроніі ў апавяданнях «Адукацыя» Якуба Коласа і «Рамэа і Джульета на Беларусі» Янкі Нёманскага).

Такім чынам, разгляд беларускіх апавяданняў 1920–1930-х гг. засведчыў вялікую запатрабаванасць белетрыстычнай паэтыкі аўтарамі тых часоў. Белетрыстычнасць у беларускім апавяданні – важны паказчык развіцця і росту літаратуры першай трэці XX ст. У рамках белетрыстыкі ёсць прыклады менш якаснай літаратуры (асабліва напачатку 1920-х гг.), якая ўяўляе сабой бытавыя бессюжэтныя замалёўкі, пабудаваныя на літаральнай перадачы рэчаіснасці, што, тым не менш, цікавіць чытача праз эфект «пазнавання рэальнасці». Аднак у 1920–1930-х гг. з’явілася і вялікая колькасць якаснай белетрыстыкі, дзе аўтары паўнавартасна раскрываюць свой творчы патэнцыял. У такіх творах можна пабачыць незвычайную форму аповеду (перамяжэнне часоў, «аповед у аповедзе», твор у лістах і інш.), выкарыстанне інтрыгі і прыхаваных дэталяў для яе стварэння, а галоўнае, пераканаўчую матывацыю ўчынкаў персанажа з элементамі псіхалагічных характарыстык. Найбольш ярка выяўляецца белетрыстычны талент такіх пісьменнікаў, як Янка Нёманскі, Эдуард Самуйлёнак, Хвядос Шынклер, Сымон Баранавых і Мікола Нікановіч. У прозе Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Міхася Лынькова, Кузьмы Чорнага белетрыстычная паэтыка выходзіла на першы план толькі ў асобных выпадках, вядучае месца належыць іншым кампанентам індывідуальных стыляў гэтых пісьменнікаў.

Творчасць Міхася Зарэцкага вылучаецца на фоне белетрыстыкі і ўсёй літаратуры свайго часу. Яго апавяданні не толькі насычаны элементамі, якія ўплываюць на чытацкую зацікаўленасць. У іх раскрыты праблемы, характэрныя як для свайго часу, так і для будучыні. Менавіта гэта зрабіла творы Міхася Зарэцкага класічнымі і актуальнымі нават сёння.

## Літаратура

1. Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс / рэд.: В. В. Барысенка, П. К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 328 с.

2. Чыгрын, І. П. Проза «Маладняка» : Дарогамі сцвярджэння / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 144 с.

3. Нёманскі, Я. Творы / Я. Нёманскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 598 с.

4. Бядуля, З. Збор твораў : у 5 т. / З. Бядуля. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – Т. 2 : Вершы ў прозе. Лірычныя імпрэсіі. Апавяданні – 351 с.

5. Галавач, П. Уцякач / П. Галавач // Расстраляная літаратура : творы беларускіх пісьменнікаў / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – С. 500–508.

6. Каваль, В. Ілька / В. Каваль // Маладняк. – 1929. – № 1. – С. 3–15.

Белорусский государственный университет Поступила в редакцию 05.12.2025